**Прамая лінія**

**ЯК ПАПЯРЭДЗІЦЬ АСТЭАПАРОЗ І ЯК З ІМ ЗМАГАЦЦА?**

Якія метады прафілактыкі і лячэння хваробы ёсць сёння? Гэтыя і іншыя пытанні вы можаце задаць падчас «прамой лініі» **загадчыцы кабінета астэадэнсітаметрыі Рэспубліканскага цэнтра медыцынскай рэабілітацыі і бальнеалячэння Наталлі Аляксееўне ВАСІЛЬЕВАЙ.** *«Прамая лінія» адбудзецца 11 красавіка ў пятніцу з 15.00 да 16.30 па нумарах 8 (017) 292 38 92 і 292 38 21. Папярэднія пытанні можна пакінуць па тэлефонах 8 (017) 287 18 36 (Вольга Шаўко) і 287 18 29 (Святлана Барысенка).*



*Родная газета на роднай мове*

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

3 КРАСАВІКА 2008 г. ЧАЦВЕР

№ 63 (26176)

Кошт 430 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.


Грошы

## Нацбанк упэўнены ў стабільнасці рубля

**Учора на першым пасяджэнні дзесятай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі перад парламентарыямі выступіў старшыня праўлення Нацыянальнага банка Пётр Пракаповіч, які не толькі праінфармаваў прысутных аб ходзе рэалізацыі асноўных напрамкаў грашова-крэдытнай палітыкі, але і адказаў на мноства пытанняў.**

Прынамсі, першы квартал прайшоў менавіта пад знакам умацавання нашай нацыянальнай валюты да амерыканскай. Штодзённая праца галоўнага банка, адной з галоўных задач якога і з'яўляецца забеспячэнне стабільнасці рубля, дала плён: за тры месяцы Br «адваяваў» у USD 0,2 працэнта, альбо 5 рублёў. Прычым, на сёлета — гэта не мяжа. Як упэўнены Пётр Пракаповіч, сітуацыя складваецца такім чынам, што рубель будзе і надалей умацоўвацца да долара. «Да канца года мы плануем выйсці на той паказчык, які закладзены ў асноўных напрамках — 2100 беларускіх рублёў за долар», — падкрэсліў галоўны банкір. Дарэчы, нагадаем, што паводле прагнозу на год, курс «завіс» у межах 2100—2200, а зараз ён складае 2145 рублёў за долар.

Летась, заўважыў Пётр Пракаповіч, мы сутыкнуліся з тым, што для стабільнасці нацыянальнай валюты з'яўляецца важным не толькі работа эканомікі ў цэлым, але, акрамя гэтага, пажадана мець і адпаведныя золатавалютныя рэзервы. Асабліва гэта актуальна ў цяперашніх умовах, калі на міжнародных фінансавых рынках перыядычна ўспыхваюць крызісы. За два тыдні леташняга студзеня, праінфармаваў Пётр Пракаповіч, краіна згубіла амаль палову сваіх золатавалютных рэзерваў. Праўда, своечасова прынятыя меры дазволілі сітуацыю стабілізаваць. Аднак адпаведныя высновы з такога «ўроку» былі зроблены і ў выніку за 2007 год, нягледзячы на складаную сітуацыю, рэспубліцы ўдалося нарасціць амаль у тры разы свае золатавалютныя рэзервы — з 1 мільярда 700 мільёнаў долараў да 4 мільярдаў 988 мільёнаў. За першы квартал гэтага ў «скарбонку» Беларусі» дадалося яшчэ 500 мільёнаў і золатавалютныя рэзервы дасягнулі 5,5 мільярда долараў. А таму, прызнаўся галоўны банкір, мы адчуваем сябе зараз упэўненымі. Аднак, дадаў ён, гэтага недастаткова: стаіць задача давесці золатавалютныя рэзервы да 10 мільярдаў долараў у 2010 годзе — у адпаведнасці з міжнароднымі нормамі іх аб'ём павінен быць не меншым за суму імпарту краіны за тры месяцы. Дарэчы, паводле слоў Пятра Пракаповіча, Нацбанк будзе імкнуцца выйсці на гэты паказчык раней за ўстаноўлены тэрмін.

Праводзячы працэнтную палітыку, галоўны банк, з аднаго боку стараецца максімальна ўлічваць інтарэсы ўкладчыкаў, з другога — крэдытаатрымальнікаў. У апошнія гады, падкрэсліў Пётр Пракаповіч, вядзецца праца па зніжэнні крэдытных ставак і ставак па дэпазітах. У той жа час, каб стаўкі былі прывабнымі і насельніцтва карысталася паслугамі банкаў пры зберажэнні грошай, стаўка рэфінансавання ў гэтым годзе не мянялася. У красавіку яна таксама застанецца нязменнай. А вось з верасня, магчыма, Нацбанк пачне плаўнае зніжэнне стаўкі. Цяпер «рэзкіх рухаў» у гэтай справе быць не павінна: так склалася, што ўзровень інфляцыі за першы квартал выйшаў за межы прагнозу (3,7 працэнта).

Таму неабходна зрабіць усё неабходнае, каб не дапусціць павышэння ўзроўню цэнаў у другім і трэцім кварталах. «Калі нам гэта ўдасца, то Нацбанк з верасня пачне плаўнае зніжэнне стаўкі», — сказаў Пётр Пракаповіч. Такім чынам, калі будзе ўпэўненасць, што па выніках года інфляцыю ўдасца ўтрымаць у межах да 8 працэнтаў, то стаўка рэфінансавання будзе знікана да 9 працэнтаў.

*(Заканчэнне на 2-й стар.)*

## Над родным горадам



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

*Родам з палескага горада Лунінца студэнт другога курса Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта **Вадзім СТАЛЯРЧУК** невыпадкова свой відэафільм, з якім удзельнічаў у рэспубліканскім конкурсе, назваў «Мая Айчына — Беларусь і кут мой родны — Лунінец». Колішні выпускнік-ліцэіст, наведваючы горад дзяцінства, радуецца яго ціхім куточкам, спакойнаму рытму жыцця, заўсёды ўпадабанаму.*

*— У наступным годзе нашаму гораду споўніцца 560 гадоў, — з гонарам кажа будучы інжынер-будаўнік.*

Парламенцкі дзённік

## Ад законаў — да кодэксаў

Учора пачала працу восьмая сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі трэцяга склікання — дарэчы, апошняя поўная сесія ў такім складзе (у кастрычніку дэпутаты збяруцца толькі для разгляду праекта бюджэту краіны).

Ужо ў першы дзень сесіі дэпутаты прынялі ў першым чытанні змяненні і дапаўненні ў некаторыя законы па пытаннях вышэйшай адукацыі, рэкламы і прыватызацыі жылых памяшканняў, папраўкі ў закон аб тэхнічным нармаванні і стандартызацыі, а таксама ратыфікавалі шэраг міжнародных пагадненняў. У другім чытанні былі прыняты змяненні і дапаўненні ў некаторыя законы па пытаннях жыллёвых адносінаў, папраўкі ў закон аб дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці, правоў на яе і здзелак з ёй. Дэпутаты таксама прынялі да ведама два дэкрэты Прэзідэнта, у прыватнасці, дэкрэт аб некаторых пытаннях рэгулявання прадпрымальніцкай дзейнасці ў вёсцы.

Самая гарачая дыскусія разгарнулася ў Авальнай зале падчас абмеркавання змяненняў у заканадаўстве па пытаннях рэкламы.

— Неабходна распрацаваць больш акрэсленую сістэму кантролю, бо нормы, устаноўленыя законам, парушаюцца — аб гэтым паступае шмат зваротаў, — адзначыла Ганна Бурава, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па жыллёвай палітыцы, будаўніцтве, гандлі і прыватызацыі. — Законапраектам, які мы сёння абмяркоўваем, прадугледжаны спагнанні ад 20 да 100 базавых велічынь, у залежнасці ад таго, якія пункты Закона «Аб рэкламе» не былі выкананы.

Больш за ўсё заўваг выклікае ў дэпутатаў рэклама на тэлебачанні: яна, маўляў, нярэдка не адпавядае нормам закона ні па гукавым афармленні, ні па працягласці. Акрамя таго, нявысветлены статус анонсаў тэлеперадач — па сутнасці, гэта тая ж рэклама.

Былі таксама прапанованы суадносіць дапушчальную долю тэлерэкламы не з гадзінай эфірнага часу, а з працягласцю канкрэтнай перадачы, каб не атрымлівалася так, што адны праграмы ішлі фактычна без перапынку, а іншыя пастаянна перарываліся камерцыйнымі ролікамі.

— За 2007 год у суд былі перададзены 25 адміністрацыйных пратаколаў па фактах парушэння заканадаўства аб рэкламе і вынесена 82 прадпісанні аб устараненні выяўленых парушэнняў, — адзначыў у сваім выступленні міністр гандлю Аляксандр Іванкоў.

*(Заканчэнне на 2-й стар.)*

## ЗАКОНЫ ПАВІННЫ БЫЦЬ ДАСТУПНЫМІ І ЗРАЗУМЕЛЫМІ

Выступленне Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Навіцкага Г.В. на адкрыцці дзесятай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання 2 красавіка 2008 года



Паважаныя члены Савета Рэспублікі, запрошаныя і журналісты!

Сёння мы пачынаем работу дзесятай сесіі Савета Рэспублікі трэцяга склікання. За плячамі тры з паловай гады мэтанакіраванай дзейнасці па паляпшэнні якасці падрыхтоўкі заканадаўчых актаў. Істотна перабудавана сістэма работы з законапраектамі. Цяпер нашы спецыялісты прымаюць удзел у іх падрыхтоўцы, пачынаючы з самых ранніх стадый. Наладжана актыўнае ўзаемадзеянне з усімі ўдзельнікамі заканадаўчага працэсу, у прыватнасці з Палатай прадстаўнікоў і Адміністрацыяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Шырока ўкаранёны інфармацыйныя тэхналогіі, якія даюць магчымасць у разы паскорыць абмен інфармацыяй.

Пра павышэнне эфектыўнасці нашага супрацоўніцтва з зацікаўленымі органамі сведчаць факты. Так, калі ў Савеце Рэспублікі першага склікання было адхілена 6,6 працэнта законапраектаў, то ў час работы другога склікання ўжо 3,5 працэнта, трэцяга — каля 3 працэнтаў законапраектаў. Зменшылася і колькасць законапраектаў, вернутых Прэзідэнтам на дапрацоўку: пры першым скліканні — 8,5 працэнта, другім — 12,5 працэнта, трэцім — 2,5 працэнта.

У мінулы міжсесіённы перыяд прадоўжылася работа па падрыхтоўцы шэрагу праектаў законаў, якія адпавядаюць патрэбнасцям грамадства, а таксама па далейшай кадыфікацыі заканадаўства. Так, рыхтуюцца да разгляду праекты кодэксаў аб зямлі і аб нетрах. Яны дадуць магчымасць комплексна ўрэгуляваць адносіны ў сферы выкарыстання зямель і аховы нетраў. Палажэнні праекта Бюджэтнага кодэкса накіраваны на сістэматызацыю бюджэтнага заканадаўства.

Вялікая цікавасць у грамадстве цяпер праяўляецца да праектаў законаў «Аб рэгістры насельніцтва» і «Аб інфармацыі, інфарматызацыі і абароне інфармацыі». У іх рэгламентуюцца такія пытанні, як стварэнне адзінай сучаснай базы даных аб фізічных асобах, пошук, збор, захоўванне, распаўсюджванне і абарона інфармацыі. Гэтыя законапраекты ацэньваюцца грамадзянамі краіны неадназначна. Мы абавязаны ўважліва ставіцца да грамадскай думкі, але і ў той жа час памятаць аб захаванні інтарэсаў нацыянальнай бяспекі.

Больш актыўнаму ўключэнню насельніцтва ў інвестыцыйную дзейнасць Рэспублікі Беларусь будзе садзейнічаць, на наш погляд, прыняцце закона «Аб кампенсацыі банкаўскіх укладаў (дэпазітаў) фізічных асобаў». Ён вызначае прававыя асновы гарантаванай дзяржаўнай кампенсацыі банкаўскіх укладаў грамадзянам у тых выпадках, калі банк самастойна гэтага зрабіць не можа.

Павысіць эфектыўнасць дзейнасці судоў дасць магчымасць прыняцце шэрагу законаў у сферы гаспадарчага і грамадзянскага судаводства. У мэтах узмацнення бяспекі руху, аховы грузаў і аб'ектаў чыгуначнага транспарту плануецца таксама ўнесці змяненні ў адпаведны закон.

Асобныя аспекты працоўных адносінаў будуць разгледжаны ў праекце закона аб ахове працы. Гэты законапраект накіраваны на рэалізацыю канстытуцыйнага права грамадзян на здароўе і бяспечныя ўмовы працы.

Прыняцце новай рэдакцыі закона «Аб ахове здароўя» дасць магчымасць пашырыць гарантыі грамадзянам на даступную і кваліфікаваную медыцынскую дапамогу. У рамках падрыхтоўкі гэтага законапраекта Саветам Рэспублікі праведзены семінар па пытаннях прававога забеспячэння развіцця масавага спорту. Мэта семінара — прыцягнуць увагу да заняткаў фізічнай культурай як асновы здаровага ладу жыцця.

Наперадзе далейшая работа па развіцці дагаворна-прававых адносінаў з іншымі дзяржавамі. Так, намечана ратыфікаваць шэраг міжурадавых пагадненняў з Венесуэлай, ПАР, Бангладэш і Індыяй.

Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

Важным складальнікам нашай работы з'яўляецца ўзаемадзеянне з мясцовымі органамі ўлады. Год таму (2 красавіка 2007 года) мы з вамі прынялі рашэнне, і пры Савеце Рэспублікі быў створаны Савет па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання. Яго дзейнасць накіравана на дасягненне канкрэтных вынікаў шляхам вывучэння актуальных праблем «глыбінкі», іх аналізу і абагульнення, выпрацоўкі механізмаў іх вырашэння.

З часу ўтварэння Савета праведзены чатыры яго пасяджэнні, выязны тэматычны семінар «Роля і месца органаў мясцовага самакіравання Брэсцкай вобласці ў вырашэнні сацыяльных пытанняў, паляпшэнні ўмоў жыцця насельніцтва». Акрамя таго, арганізавана пасяджэнне круглага стала і прайшло 14 сустрэч са старшынямі Саветаў дэпутатаў базавага і пярвічнага ўзроўняў па найбольш вострых праблемах іх дзейнасці.

Па выніках гэтых мерапрыемстваў распрацаваны і накіраваны Саветам дэпутатаў абласнога і базавага ўзроўняў рэкамендацыі па парадку фарміравання іх бюджэтаў, выпрацаваны прапановы па аптымізацыі перадачы сістэм водазабеспячэння, дарог і іншых аб'ектаў на баланс спецыялізаваных арганізацый, пачата работа па інвентарызацыі шахтавых калодзежаў як сістэмы водазабеспячэння. Прымаюцца таксама неабходныя меры па ўмацаванні матэрыяльна-тэхнічнай базы Саветаў дэпутатаў, павышэнні эфектыўнасці аказання паслуг насельніцтву на месцах. Вырашаецца шэраг іншых важных для людзей пытанняў.

Гэта сур'ёзная і вялікая работа, вядома, знаходзіцца ў пачатковай стадыі і патрабуе свайго далейшага развіцця і ўдасканалення. Галоўнае пры гэтым — павысіць эфектыўнасць і рэзультатыўнасць работы органаў мясцовага кіравання і самакіравання і перанесці, калі можна так выказацца, «цэнтр цяжару» вырашэння пытанняў жыццезабеспячэння людзей непасрэдна на месцы.

*(Заканчэнне на 2-й стар.)*

## РАБІЦЬ ЖЫЦЦЁ ЛЮДЗЕЙ БОЛЬШ ПРОСТЫМ, ЛЁГКІМ І КАМФОРТНЫМ

Выступленне Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Папова В.А. на адкрыцці восьмай сесіі Палаты прадстаўнікоў 2 красавіка 2008 года



Паважаныя калегі, члены Урада, запрошаныя і журналісты!

Пачынае работу чарговая, восьмая сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання.

За тры міжсесіённыя месяцы сфарміраваны даволі аб'ёмны пакет праектаў нарматыўных прававых дакументаў, рэкамендаваных Саветам Палаты прадстаўнікоў для ўключэння ў парадак дня, які будзе прапанаваны да зацвярджэння на сённяшнім пленарным пасяджэнні.

Да разгляду падрыхтавана 38 пытанняў, сярод якіх 12 законапраектаў у першым чытанні, 10 — у другім, 9 — аб ратыфікацыі міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь.

Нам трэба будзе таксама разгледзець 6 дэкрэтаў кіраўніка дзяржавы.

У працэсе работы мы будзем уключаць у парадак дня сесіі і іншыя дакументы. Зразумела, па меры іх гатоўнасці да абмеркавання.

Мяркуючы па створанай заканадаўчай аснове і новых тэмах, што прапрацоўваюцца ў профільных камісіях, за перыяд сесіі будзе разгледжана больш як 120 пытанняў.

Так што, паважаныя калегі, восьмая сесія будзе вельмі напружаная і запатрабуе максімальнай мабілізаванасці. Як арганізацыйнай, дзелавой, так і творчай, інтэлектуальнай.

Усім нам неабходна з першага ж дня настроіцца на інтэнсіўны тэмп і вельмі шчыльны графік работы.

Упэўнены, што наш заканатворчы багаж будзе дастаткова важкі, каб дастойна зрабіць справаздачу перад выбаршчыкамі.

Адкрываючы гэту сесію, нам трэба падвесці вынікі выканання задач, пастаўленых перад парламентарыямі кіраўніком дзяржавы, і адказаць на тыя пытанні, якія штодзень ставіць перад намі, заканадаўцамі, імклівае жыццё.

А яны падобныя, узаемазвязаныя і ўкладваюцца ў простую фармулёўку: законы актуальныя і дзейсныя толькі тады, калі ідуць ад жыццёвых праблем і дапамагаюць іх вырашэнню на аснове аптымальнага балансу дзяржаўных і грамадскіх інтарэсаў.

Мы з вамі, паважаныя дэпутаты, яшчэ раз пераканаліся ў гэтым у міжсесіённы перыяд у ходзе рабочых паездак у выбарчыя акругі, сустрэч у працоўных калектывах, прыёмаў грамадзян, удзелу ў сесіях мясцовых Саветаў дэпутатаў, пасяджэннях абласных, раённых, гарадскіх і пасялковых выканаўчых камітэтаў, а таксама ў калегіях міністэрстваў і ведамстваў.

Думаю, што новыя ідэі, якія нарадзіліся ў час работы ў акругах, профільных камісіях, увасобяцца ў прыняцці адпаведных чаканням нашага грамадства заканадаўчых рашэнняў, і гаворачы словамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі, што могуць рабіць жыццё людзей больш простым, лёгкім і камфортным.

Хацеў бы асабліва адзначыць, што падрыхтаваны да разгляду на восьмай сесіі пакет нарматыўных прававых дакументаў з'яўляецца вынікам нашай сумеснай работы з Саветам Міністраў, Адміністрацыяй Прэзідэнта і іншымі ўдзельнікамі заканатворчага працэсу.

Тры міжсесіённыя месяцы былі напоўнены калектыўным абмеркаваннем аптымальных мераў заканадаўчага забеспячэння стратэгічных напрамкаў жыццядзейнасці краіны, пошукам агульных падыходаў да прававога рэгулявання тых або іншых пытанняў. Вельмі важна, каб і ў далейшым наша ўзаемадзеянне выбудоўвалася выключна прадметна, па траекторыі канструктывізму і рэзультатыўнасці.

Вызначальнай рысай восьмай сесіі будзе разгляд шэрагу сістэмных заканадаўчых актаў, якія з'яўляюцца ў пэўнай меры знакавымі для развіцця ўсёй нацыянальнай нарматыўна-прававой платформы.

У першую чаргу маю на ўвазе праекты кодэксаў аб зямлі, аб нетрах і праект Бюджэтнага кодэкса.

Гэтыя буйныя прававыя дакументы на шляху да прыняцця спачатку ў першым, а цяпер і другім чытанні вытрымалі вельмі сур'ёзную комплексную экспертызу, прайшлі грунтоўную перапрацоўку ў профільных камісіях і, як уяўляецца, пры іх прыняцці адыграюць чаканую стымулюючую ролю ў праводзімай дзяржавай эканамічнай палітыцы.

На развіццё рынкавых эканамічных інстытутаў, стварэнне новых механізмаў прававога рэгулявання адносінаў уласнасці накіраваны праект Закона «Аб іпатэцы».

Асобным нарматыўным актам сістэматызуецца прававая база ў галіне інфармацыі, інфарматызацыі і абароны інфармацыі. Законапраект, які комплексна рэгулюе гэту галіну грамадскіх адносінаў, вызначае каардынаты фарміравання ў нашай краіне сучаснай інфармацыйнай прасторы. У ім таксама вызначана траекторыя развіцця рынку інфармацыйных паслуг.

Сярод іншых ключавых тэм, на якіх мы сканцэнтруем увагу, — Дзяржаўная граніца Рэспублікі Беларусь, прафілактыка правапарушэнняў, процідзеянне экстрэмізму, прыродакарыстанне, адукацыя.

Па адных з іх падрыхтаваны новыя заканадаўчыя акты, па іншых нам трэба абмеркаваць неабходныя папраўкі. Але пры ўсім тэматычным адрозненні гэтыя законапраекты забяспечваюць прававое суправаджэнне праводзімага ў краіне палітычнага курсу на паляпшэнне жыцця людзей.

У ліку прыярытэтаў сесіі праекты законаў вялікага сацыяльнага гучання: «Аб ахове працы», «Аб кампенсацыі банкаўскіх укладаў (дэпазітаў) фізічных асобаў», праекты новай рэдакцыі законаў «Аб абароне правоў спажыўцоў», «Аб ахове здароўя».

*(Заканчэнне на 2-й стар.)*

## РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### ВІЗІТ ПРЭЗІДЭНТА БЕЛАРУСІ Ў В'ЕТНАМ ЗАПЛАНАВАНЫ НА ПЕРШУЮ ПАЛОВУ КРАСАВІКА

На першую палову красавіка запланаваны афіцыйны візіт Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ў В'етнам. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.

### РАСІЙСКІ ГАЗ: ЦАНА СЁЛЕТА ЎЖО НЕ ЗМЕНІЦЦА

**Прынамсі, да канца гэтага года кошт яго павялічвацца дакладна не будзе, пра што паведаміў журналістам Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Расіі ў Беларусі Алякандр Сурыкаў.**

Як адзначыў Аляксандр Сурыкаў, згодна з дамоўленасцямі паміж нашымі краінамі цана на газ можа быць павялічана толькі раз у год і гэты рост не павінен перавышаць 7 працэнтаў. Нагадаем, што з 1 красавіка цана блакітнага паліва для Беларусі была павышана са 119 долараў за тысячу кубаметраў да 128.

**Ігар ГРЫШЫН.**

### УРАД ЗАЦВЕРДЗІЎ ПЕРАЛІК САЦЫЯЛЬНА ЗНАЧНЫХ ТАВАРАЎ, ДА ЯКІХ НЕ ПРЫМЯНЯЮЦЦА СВАБОДНЫЯ ЦЭНЫ

**Рашэнне аб гэтым змяшчаецца ў пастанове Савета Міністраў № 454, якая ўступіла ў сілу з 1 красавіка гэтага года.**

Паводле слоў начальніка аддзела цэнаўтварэння Мінсельгасхарча Кацярыны Пеўневай, у пералік уключаны мука (для хлебапячэння), хлеб і хлебабулачныя вырабы, малако, кефір, смятана, тварог, малочныя сумесі, мясныя кансервы для дзіцячага харчавання, мяса (ялавічына, свініна), цукар, заменнікі цукру для хворых на цукровы дыябет, бульба і плодаагародніннная прадукцыя (цэны на гэтыя тавары рэгулююцца дзяржавай на падставе пастановы Саўміна № 943 ад 18 чэрвеня 1999 года). Акрамя таго, у дакумент увайшлі тавары для дзяцей — па пераліку, што вызначаецца Міністэрствам гандлю і Белкаапсаюзам. Як паведаміла начальнік аддзела цэнаўтварэння Мінгандлю Раіса Юдзенка, гэты пералік пашыраны да 102 назваў. Разам з сухімі, малочнымі, вадкімі і пастападобнымі сумесямі, мяснымі, мяса-расліннымі і рыбнымі кансервамі для дзіцячага харчавання, а таксама кансервамі на плодаагародніннай аснове, у гэтым годзе ў яго ўпершыню ўвайшлі пітная вада, кандытарскія вырабы (у прыватнасці, спецыяльнае пячэнне для хворых дзяцей). Акрамя таго, вельмі пашырана група сацыяльна значных прамысловых тавараў для дзяцей (бялізна, верхні і ніжні трыкатаж, панчошна-шкарпэтачныя вырабы, галаўныя ўборы, школьнае адзенне і абутак, мыла дзіцячае і пральны парашок для дзяцей, дзіцячыя ваннaчкі і многае іншае).

**БЕЛТА.**

### ТРАГЕДЫЯ Ў ТАНКУ

**На палігоне 72-га Аб'яднанага вучэбнага цэнтра, што паблізу Барысава, загінуў малады салдат.**

Паводле звестак прэс-службы Міністэрства абароны краіны, трагедыя здарылася падчас планавых заняткаў па кіраванні танкам Т-72. Курсант, які праслужыў у войску ўсяго 2 месяцы, не справіўся з кіраваннем баявой машынай і наехаў на сасну. Неверагодна, але факт! Абломкі дрэва выціснулі браніраваны люк запаснога выхаду, які знаходзіцца ў днішчы танка менавіта пад сядзеннем механіка-вадзіцеля. У выніку вайсковец атрымаў смяротную траўму. У прэс-службе падкрэслілі, што гэта першы падобны выпадак у гісторыі танкавых войскаў. Як правіла, танкі дрэваў не баяцца. Цяпер абставіны трагедыі вывучае спецыяльная камісія, у склад якой уваходзяць прадстаўнікі Міністэрства абароны і Беларускай ваеннай пракуратуры. Міністэрства абароны выказвае спачуванне родным і блізкім загінулага салдата. Варта адзначыць, што за апошні месяц гэта ўжо другі выпадак гібелі салдата беларускай арміі. 17 сакавіка ў адной з часцей транспартных войскаў Барысаўскага гарнізона ў выніку парушэння тэхнікі бяспекі загінуў бульдазерыст.

**Мікола ДЗЯБЁЛА.**

### «КРОСАМ» ПА ПРАСПЕКЦЕ З ПІСТАЛЕТАМ У РУЦЭ

**Увечары 1 красавіка ў дзяжурную часць Першамайскага РУУС сталіцы пазваніў адзін з жыхароў дома № 80 па праспекце Незалежнасці. Ён паведаміў, што нейкія невядомыя хлопец і дзяўчына спрабуюць залезці на дах іх 9-паверхоўкі.**

Калі прыбыў нарад аддзела «Ахова», парачка была ўжо на даху. Відавочна, хлопец заўважыў нарад, і калі міліцыянеры блакавалі пад'езд, ён выскачыў з дзвярэй з крыкам «Назад, буду страляць!» і кінуўся ўцякаць. У руцэ яго быў пісталет. Уцекача затрымалі. У яго канфіскавалі пісталет замежнай вытворчасці з глушыцелем і адным патронам у патронніку. Пры допыце затрыманы, ім аказаўся 27-гадовы магіляўчанін, патлумачыў, што ў Мінску ён каля тыдня і жыве ў знаёмых. Пісталет знайшоў і нават некалькі разоў страляў з яго па смеццевых баках у раёне плошчы Перамогі...

**Аляксей ЦІТОЎ.**

### ТІВО — 15 ГАДОЎ




4 красавіка 2008 года Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь уводзіць у паштовае абарачэнне марку «ТІВО — 15 гадоў», падрыхтаваную ІЦ «Марка» РУП «Белпошта». Мастак Яўген Сіманенка. У дзень выхаду маркі ў абарачэнне на Мінскім паштамце будзе праводзіцца спецыяльнае гашэнне на канверце «Першы дзень».

### МЗС БЕЛАРУСІ З НЕДАЎМЕННЕМ УСПРЫНЯЎ ІНФАРМАЦЫЮ АБ ПАЧАТКУ АФАРМЛЕННЯ ПОЛЬСКІМ БОКАМ «КАРТАК ПАЛЯКА»

**Як адзначыў прэс-сакратар знешнепалітычнага ведамства Андрэй Папоў, «адпаведны польскі закон насуперак міжнароднаму праву і практыцы быў прыняты без папярэдніх кансультацый з урадам Беларусі».**

«Мы ўнеслі абгрунтаваную і, з нашага пункту погляду, канструктыўную прапанову звярнуцца ў Венецыянскую камісію Савета Еўропы за прававой ацэнкай адпаведнасці закона «Картка паляка» міжнародным абавязацельствам Польшчы. Адначасова беларускі бок прапанаваў увесці мараторый на прымяненне гэтага закона да атрымання кваліфікаванага заключэння міжнародных экспертаў». На жаль, спробы беларускага боку ўрэгуляваць пытанне прававым шляхам праігнараваны.

**БЕЛТА.**


белагропромбанк
традиции будущего

**Открытое акционерное общество «Белагропромбанк»**

**СООБЩАЕТ, ЧТО 14 АПРЕЛЯ 2008 ГОДА ПРОВОДИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ.**

*220036, г.Минск, проспект Жукова, 3.*

**ПОВЕСТКА ДНЯ**

1. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.
2. Об утверждении дополнений и изменений в Устав ОАО «Белагропромбанк».

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании, — 1 апреля 2008 года.

Для получения бюллетеней для заочного голосования просим обращаться в ОАО «Белагропромбанк», его филиалы, отделения и расчетно-кассовые центры по месту нахождения акционеров.

Бюллетени для заочного голосования представляются не позднее 10 апреля 2008 года.

С решениями, принятыми Общим собранием акционеров банка, можно будет ознакомиться в учреждениях ОАО «Белагропромбанк» после 23 апреля 2008 года.

**Телефоны для справок: 8(017) 250 60 01, 228 53 03.**

**КОНТАКТ-ЦЕНТР БАНКА**

Тел.: короткий номер 136
(звонок бесплатный на территории РБ),
(017) 218 57 77, 8 029 1 985 777 (Velcom), 8 025 9 185 777 (БеСТ),
8 029 8 885 777 (МТС).

Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ от 27.10.2006 г. № 2. УНП 100693551.


ISSN 1990 - 763X

**КУРСЫ ВАЛЮТ**

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 03.04.2008 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 145,00 |
| 1 еўра | 3 347,92 |
| 1 латвійскі лат | 4 798,66 |
| 1 літоўскі літ | 969,56 |
| 1 чэшская крона | 133,80 |
| 1 польскі злоты | 958,36 |
| 1 расійскі рубель | 90,62 |
| 1 украінская грыўня | 430,29 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

Цэнтрабанк РФ

| | |
|---|---|
| USD | 23,6706 |
| 10 UAH | 46,9767 |
| 1000 BYR | 11,0224 |
| EUR | 36,8693 |

*Курс у гандлёвых кампаніях (на 02.04.2008 г.)*

| | |
|---|---|
| USD | 2135 / 2210 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова


*Падпісвайцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

*ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009*


## Каля 40 працэнтаў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў уступілі ў РГА «Белая Русь»

**Такую інфармацыю паведаміў у размове з карэспандэнтам член Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічнаму прагрэсу, намеснік старшыні РГА «Белая Русь» Аляксандр Шацько.**

Парламентарый таксама паведаміў, што «ў сярэднім сёння гэта грамадскае аб'яднанне налічвае каля 75 тыс. чалавек, але гэта лічба павялічваецца вельмі хутка».

Аляксандр Шацько паведаміў, што з'езд РГА «Белая Русь» павінен прайсці 17 мая ў Мінску.

**БЕЛТА.**

# Проектная декларация застройщика

**Сведения о застройщике:**
Белорусско-английское Совместное Предприятие «Лада ОМС-Холдинг» закрытое акционерное общество (СП «Лада ОМС-Холдинг» ЗАО).

**Местонахождение:** г. Минск, ул. Грушевская, 91, пом. 4Н.

**Режим работы:** рабочие дни — с понедельника по пятницу; рабочие часы — с 8 ч. 30 мин. по 17 ч. 30 мин.; обед — с 13 ч. 00 мин. по 14 ч. 00 мин.; выходные дни — суббота, воскресенье.

**Данные о государственной регистрации:** зарегистрировано Министерством иностранных дел Республики Беларусь в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей 29 июня 2001 г. за № 100934617.

**Сведения о проектах жилых домов**, введенных в эксплуатацию за последние три года:
1. 9-этажный 5-секционный 175-квартирный жилой дом № 91 по ул. Грушевской в г. Минске.
2. 15—17-этажный односекционный 82-квартирный жилой дом № 15 по ул. Маяковского в г. Минске со встроенно-пристроенными помещениями подземного гаража-стоянки, магазина и аптеки.
3. 7-этажный 5-секционный 135-квартирный жилой дом в районе улиц Щорса — Разинская (планируемый срок ввода дома — 3-й квартал 2008 г.).

**Лицензия** на право осуществления деятельности «Проектирование и строительство зданий и сооружений I, II уровней ответственности и проведения инженерных изысканий для этих целей» № 02250/0264721 со сроком действия по 29.11.2009 г., выданная Министерством архитектуры и строительства Республики Беларусь.

**Цель проекта** — строительство 15-этажного 89-квартирного односекционного блочнокаркасного жилого дома на пересечении улиц 5-я Щорса — Декабристов с привлечением денежных средств граждан путем заключения договоров создания объектов долевого строительства.

**Сведения об этапах и сроках реализации** — третий квартал 2008 г.

**У Застройщика имеются**: проектно-сметная документация, прошедшая в установленном порядке государственную экспертизу 23.12.2005 г., 31.05.2007 г. и 09.11.2007 г., государственную экологическую экспертизу 28.11.2005 г. и согласована с Комитетом архитектуры и градостроительства Мингорисполкома 19.09.2007 г. № 09-19/127М; разрешение на производство строительно-монтажных работ от «13» апреля 2007 г. № 2-203Ж-003/07.

**Местонахождение строящегося объекта**: г. Минск, ул. 5-я Щорса — Декабристов.

**Цена одного квадратного метра** общей площади жилых помещений составляет — 4 290 000 белорусских рублей на момент опубликования декларации.

**Количество предлагаемых для заключения договоров создания объектов долевого строительства** — 18 (на 1-комнатные квартиры — 7 шт., 2-комнатные — 6 шт., 3-комнатные — 5 шт.).

**Данные о правах Застройщика на земельный участок:** земельный участок предоставлен Застройщику решением Мингорисполкома от 24.08.2006 г. № 1670 площадью 1.0937 га, граничит с земельными участками г. Минска, ЗАО «Витекс», УП «Трест Белтрансстрой», УП «Ремфорт», ИП Терешко Н.И., УП «Минское отделение Белорусской железной дороги».

**Элементы благоустройства:** создаются площадки для отдыха, занятия спортом, детская площадка, газоны, озеленение; покрытие проездов к дому — двухслойный асфальтобетон, тротуаров — мелкоразмерная плитка, дорожек и площадок — спецсмесь и плитка.

**Общее имущество дольщиков** — межквартирные лестничные клетки, лестницы, коридоры, крыша, техподполье, крышная котельная, несущие, ограждающие конструкции, оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и нежилых помещений, элементы благоустройства и озеленения.

**Помещения, не входящие в состав общего имущества дольщиков.**
